Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца штомесячна,
з II паўгоддзя 2011 года
Зарэгістраваны ў Міністэрстве
інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Пасведчанне ад 25.04.2011 № 1440

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
ВЫДАВЕЦТВА

Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

# ГІСТОРЫЯ і грамадазнаўства

№ 12 (30) 2013

Заснавальнік і выдавец —
РУП «Выдавецтва
"Адукацыя і выхаванне"»
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Вул. Будзённага, 21,
220070, г. Мінск;
тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу),
факс: 297-91-49
e-mail: aiv@aiv.by,
http://www.aiv.by

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

**Мікалай Іосіфавіч МІНЦКІ** — галоўны рэдактар, доктар гістарычных навук, прафесар
**П. Р. МАРТЫСЮК** — першы намеснік галоўнага рэдактара, доктар філасофскіх навук, дацэнт
**Н. М. ГАНУШЧАНКА** — намеснік галоўнага рэдактара, кандыдат гістарычных навук
**Л. В. САЛАМАХА** — адказны сакратар
**Л. В. ЖЭРКА**
**В. М. ВАРАНОВІЧ**
**С. А. КУДРАЎЦАВА**
**Л. І. ШЧЭНІКАВА**

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА

**В. У. ПАЗНЯКОЎ** — старшыня рэдакцыйнай рады, доктар філасофскіх навук, прафесар
**Я. М. БАБОСАЎ**, доктар філасофскіх навук, прафесар, акадэмік
**С. А. БАЛАШЭНКА**, доктар юрыдычных навук, прафесар
**В. В. БУШЧЫК**, доктар палітычных навук, прафесар
**П. А. ВАДАП'ЯНАЎ**, доктар філасофскіх навук, прафесар
**М. І. ВІШНЕЎСКІ**, доктар філасофскіх навук, прафесар
**В. В. ДАНІЛОВІЧ**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
**М. М. ЗАБАЎСКІ**, доктар гістарычных навук, прафесар
**А. А. КАВАЛЕНЯ**, доктар гістарычных навук, прафесар
**В. А. КАПРАНАВА**, доктар педагагічных навук, прафесар
**П. С. КАРАКА**, доктар філасофскіх навук, прафесар
**Г. У. КАРЗЕНКА**, доктар гістарычных навук, прафесар
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ**, доктар гістарычных навук, прафесар
**У. С. КОШАЛЕЎ**, доктар гістарычных навук, прафесар
**М. А. МАЖЭЙКА**, доктар філасофскіх навук, прафесар
**С. В. ПАНОЎ**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт
**С. В. РАШЭТНІКАЎ**, доктар палітычных навук, прафесар
**С. М. ХОДЗІН**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
**І. І. ЦЫРКУН**, доктар педагагічных навук, прафесар

# Вячаслаў Віктаравіч Даніловіч: кіраўнік, вучоны, педагог

Восеньскія дні — гэта не толькі перыяд прыроднага падвядзення вынікаў, але і час, калі закладваюцца асновы будучага абуджэння жыцця. Восень, неаднаразова апетая паэтамі, з'яўляецца часам творчага ўздыму, рамантычных летуценняў і навуковых адкрыццяў. Менавіта восеньскай парою адзначае свой дзень нараджэння Вячаслаў Віктаравіч ДАНІЛОВІЧ. Гэта яшчэ даволі малады па ўзросце, але сталы паводле дасведчанасці і светапогляду беларускі гісторык, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Нарадзіўся Вячаслаў Віктаравіч 21 лістапада 1973 г. у Полацку — слаўным беларускім горадзе са шматвекавой гісторыяй. Яго бацькі — Яніна Вікенцьеўна і Віктар Іосіфавіч — сціплыя, адораныя прыродным пачуццём дабрыні і ласкі людзі, выхоўвалі дзяцей, паказваючы хараство прыроды і багацце беларускай зямлі.

Яшчэ ў дзяцінстве будучы навуковец пачаў цікавіцца гісторыяй. Паспрыяў гэтаму дзядуля Іосіф Пятровіч Канюшэўскі, які ў гады Вялікай Айчыннай вайны ваяваў супраць германскіх захопнікаў у складзе партызанскага атрада «Камсамольскі» брыгады імя І. В. Сталіна на Расоншчыне. У Іосіфа Пятровіча была даволі багатая бібліятэка, дзе і трапілася на вочы будучаму гісторыку манаграфія Георгія Васільевіча Штыхава, прысвечаная гісторыі старажытнага Полацка.

Знаёмства са старажытнымі артэфактамі полацкай зямлі зрабіла моцнае ўражанне і фактычна прадвызначыла яго жаданне стаць прафесійным гісторыкам. Відавочна, паспрыяла гэтаму і захапленне ў падлеткавым узросце філатэліяй, фалерыстыкай і нумізматыкай.

З цеплынёй і ўдзячнасцю ўспамінае Вячаслаў Віктаравіч школьных настаўнікаў. Менавіта пад іх уплывам фарміраваліся творчыя задаткі і светапогляд будучага навукоўца. З вялікай павагай ён успамінае настаўніцу пачатковых класаў А. М. Ложнік, якая навучыла здабываць веды і стварыла неабходны падмурак для далейшай вучобы. Шмат душэўных сіл і энергіі аддавалі працы з вучнямі настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Г. М. Гайдук, гісторыі — Л. В. Жыхарава, нямецкай мовы — Т. М. Касцючонак, настаўнікі спеваў і музыкі А. М. Святун, рускай мовы і літаратуры — Я. Б. Гуткін.

Атрымаўшы адукацыю ў сярэдняй школе № 9 г. Наваполацка, Вячаслаў Віктаравіч у 1991 г. паступіў на гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. Студэнцкія гады былі напоўнены знаёмствам з надзвычай цікавымі людзьмі — выкладчыкамі, якія чыталі лекцыі і вялі семінарскія заняткі, арганізоўвалі вучэбна-выхаваўчы працэс на факультэце. Дзякуючы ў першую чаргу такім асобам, як У. В. Тугай, А. М. Люты, Г. А. Космач, А. П. Вахніна, М. І. Мініцкі, І. Р. Чыкалава, І. І. Багдановіч, А. Р. Праннік, І. Б. Канапацкі, А. А. Цобкала, В. А. Зенчанка, Вячаслаў Віктаравіч атрымаў не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, але і набыў першы вопыт навуковых даследаванняў.

Пасля заканчэння вучобы малады спецыяліст працаваў настаўнікам гісторыі СШ № 2 г. Наваполацка. У лістападзе 1996 г. Вячаслаў Віктаравіч быў залічаны ў аспірантуру на кафедру гісторыі Беларусі сваёй alma-mater.

З вялікай удзячнасцю ён успамінае свайго навуковага кіраўніка — «таленавітага вучонага і проста выдатнага чалавека» доктара гістарычных навук, прафесара Аляксандра Мікалаевіча Мацко, які, дзелячыся сваёй жыццёвай мудрасцю, дапамагаў іншым настойліва і мэтанакіравана пракладаць шлях у навуку.

Пасля заканчэння аспірантуры Вячаслаў Віктаравіч у снежні 1999 г. пачаў працаваць на кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, дзе прайшоў выдатную школу выкладчыцкай і навуковай працы. На кафедры, якую ўзначальваў А. А. Каваленя, панавала атмасфера добразычлівасці і даверу. Старэйшыя таварышы — А. А. Каваленя, С. І. Альшэўская, С. Д. Жмуроўскі, Г. В. Жылінскі, Т. Ю. Калядзінская, В. Ф. Касовіч, А. К. Лабанок, В. П. Паўлоўская, М. У. Смяховіч, Л. А. Шульга — заўсёды былі гатовы прыйсці на дапамогу маладым калегам.

Дзякуючы настойлівасці, а таксама дапамозе і падтрымцы з боку калег Вячаслаў Віктаравіч 28 красавіка 2000 г. паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Дзейнасць арганізацыі “Змаганне” ў Заходняй Беларусі (1927—1930 гг.)» і атрымаў ступень кандыдата гістарычных навук.

Плённай была і выкладчыцкая дзейнасць маладога навукоўца. На працягу пяці гадоў ён прайшоў шлях ад асістэнта да дацэнта кафедры. 15 чэрвеня 2005 г. Пастановай Прэзідыума Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь В. В. Даніловічу было прысвоена вучонае званне дацэнта па спецыяльнасці «гісторыя».

У 2006 г. Вячаслаў Віктаравіч звязаў свой лёс з Інстытутам гісторыі НАН Беларусі. Яму выпаў гонар працаваць разам з такімі мэтрамі гістарычнай навукі, як М. П. Касцюк, Г. В. Штыхаў, П. Ф. Лысенка, Г. Я. Галенчанка, В. М. Ляўко, А. Г. Калечыц, А. М. Літвін. Да 2010 г. В. В. Даніловіч займаў пасаду намесніка дырэктара Інстытута па навуковай рабоце, а 1 кастрычніка 2010 г. узначаліў гэту навуковую ўстанову.

Вячаслаў Віктаравіч заўсёды з цеплынёй і ўдзячнасцю гаворыць пра свайго папярэдніка на пасадзе дырэктара — доктара гістарычных навук, прафесара А. А. Кавалeню, пад кіраўніцтвам якога ён прайшоў выдатную школу навукова-арганізацыйнай працы і якога ён лічыць сваім духоўным настаўнікам.

Высокай эрудыцыяй, добразычлівасцю, прыроджанай інтэлігентнасцю і паважлівымі адносінамі да падначаленых Вячаслаў Віктаравіч заслужыў павагу ў творчага калектыву Інстытута гісторыі. В. В. Даніловіч з'яўляецца старшынёй Навуковага савета Інстытута гісторыі НАН Беларусі, а таксама Апякунскага савета Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, намеснікам галоўнага рэдактара «Гістарычна-археалагічнага зборніка», членам рэдакцыйнай калегіі часопіса «Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук», членам рэдакцыйных саветаў часопіса «Гісторыя і грамадазнаўства» і «Беларускага гістарычнага часопіса», а таксама навуковым рэдактарам шэрагу навуковых артыкулаў і матэрыялаў навуковых канферэнцый, манаграфій.

Пад кіраўніцтвам В. В. Даніловіча вучонымі Інстытута гісторыі НАН Беларусі за 2011—2013 гг. зроблены значны крок наперад у развіцці навуковых гістарычных даследаванняў. Выяўлены дзясяткі новых помнікаў археалогіі, праведзены шырокамаштабныя комплексныя археалагічныя даследаванні ва ўсіх абласцях краіны, у зонах будаўніцтва Гродзенскай і Полацкай ГЭС, Беларускай АЭС. Апублікаваны 36 манаграфій, 26 зборнікаў навуковых прац, 8 зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, 17 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, 7 археаграфічных і даведачна-інфармацыйных выданняў, звыш 700 навуковых артыкулаў.

З'яўляючыся членам Асацыяцыі Інстытутаў гісторыі краін СНД, Вячаслаў Віктаравіч прыкладае шмат намаганняў па наладжванні міжнародных сувязей Інстытута гісторыі НАН Беларусі з армянскімі, в'етнамскімі, германскімі, іранскімі, казахскімі, кыргызскімі, латвійскімі, малдаўскімі, польскімі, расійскімі, сербскімі, таджыкскімі, французскімі і ўкраінскімі навукова-даследчымі ўстановамі. Добрым плёнам яго працы з'явіліся дамовы аб супрацоўніцтве, падпісаныя Інстытутам гісторыі НАН Беларусі з Інстытутам гісторыі Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук, гістарычным факультэтам Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. У. Ламаносава, Рэгіянальнай грамадскай арганізацыяй «Нацыянальна-культурная аўтаномія “Беларусы Масквы”», Расійскім дзяржаўным

гуманітарным універсітэтам, Выратавальнай археалагічнай службай Інстытута археалогіі Нацыянальнай акадэміі навук Украіны, Інстытутам гісторыі і этналогіі імя Ч. Ч. Валіханава Камітэта навукі Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Казахстан, Інстытутам археалогіі і этналогіі Польскай акадэміі навук, Падляскім музеем у Беластоку (Польшча), Х'юэскім універсітэтам В'етнама.

Нягледзячы на вялікую загружанасць працай кіраўніка, Вячаслаў Віктаравіч надае значную ўвагу папулярызацыі гістарычных ведаў. Ён выступае з цікавымі змястоўнымі артыкуламі на старонках перыядычных выданняў, на радыё і тэлебачанні, на шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях, семінарах і сімпозіумах. Ім распрацаваны і чытаецца ў Полацкім дзяржаўным універсітэце спецкурс «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». В. В. Даніловіч — аўтар больш за 110 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку 10 манаграфій (9 у суаўтарстве), 3 вучэбныя (у суаўтарстве) і 6 вучэбна-метадычных дапаможнікаў, адным са складальнікаў трох зборнікаў дакументаў.

Вячаславам Віктаравічам зроблены асабісты ўклад у падрыхтоўку навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Пад яго кіраўніцтвам была выканана і паспяхова абаронена кандыдацкая дысертацыя К. С. Разуванавай.

Актыўная навуковая і арганізацыйная праца В. В. Даніловіча адзначана стыпендыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным, Ганаровай граматай Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Ганаровай граматай Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь (2009 г.), а таксама юбілейным медалём «У гонар 80-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» — у 2011 г.

Жадаем шаноўнаму Вячаславу Віктаравічу новых творчых дасягненняў на карысць гістарычнай навукі дзеля росквіту нашай Бацькаўшчыны.

***А. А. Каваленя, М. Г. Жылінскі, М. І. Мініцкі, В. Л. Лакіза, В. М. Ляўко, У. І. Кузьменка, М. У. Смяховіч, В. Г. Мазец***

# Георгий Владимирович Корзенко: портрет учёного и педагога

24 декабря 2013 г. отмечает 60-летний юбилей заведующий кафедрой политологии и права Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка (БГПУ), доктор исторических наук, профессор Георгий Владимирович КОРЗЕНКО. Он родился в г. Минске. После окончания школы учился в Минском государственном педагогическом институте имени А. М. Горького на историко-иностранном факультете. Именно здесь он подготовил две работы, представленные на Всесоюзный конкурс студенческих научных работ и стал дважды лауреатом.

Новый этап творческой деятельности Г. В. Корзенко связан с Институтом истории НАН Беларуси. Будучи причастным к настоящему учреждению, он на протяжении многих лет задаёт в нём планку в освоении проблемного поля, связанного с историей науки. Поступив в аспирантуру (1980), Г. В. Корзенко проходил научную школу крупного учёного, члена-корреспондента П. Т. Петрикова. После защиты кандидатской диссертации работал младшим научным сотрудником. Имея здоровые амбиции, активно готовился к участию в смотрах-конкурсах работ молодых учёных по общественным наукам. Лауреат Республиканского и Всесоюзного конкурсов молодых учёных. Более чем за 30-летний период он прошёл все возможные карьерные ступени в отделе истории

науки: был старшим, ведущим научным сотрудником, руководил группой истории науки и отделом истории науки (с 2005 г. — отдел социально-экономической истории, науки и культуры), заведовал центром истории постиндустриального общества.

Для профессионального роста учёного важное значение имела защита докторской диссертации, посвящённой научной интеллигенции Беларуси в 1944—1990 гг. Автор показал сложный и длительный процесс изменения места и роли учёного в социальной структуре советского общества. Отражён противоречивый и непоследовательный характер государственной политики, при которой система подготовки научных кадров отличалась низкой эффективностью, не учитывала мировые научно-технические реалии. Закрытые ранее статистические и архивные материалы позволили по-новому интерпретировать тенденции роста научных сил, изменения их динамики, профессиональной структуры и т. д. Книга получила широкий резонанс в научном сообществе. Став доктором наук, Георгий Владимирович начал более активно реализовывать себя как организатор; разрабатывает новые проблемы, исходя из перечня приоритетных направлений фундаментальных и прикладных научных исследований Республики Беларусь. Он инициировал изучение истории отечественной исторической науки в 90-х гг. XX в., подготовку первых документальных сборников по истории Академии наук, персоналий национальной науки, международного научно-технического сотрудничества, проблем культуры и т. д.

В 2006 г. учёный возвращается в альма-матер, не порывая связи с Институтом истории НАН Беларуси, руководит кафедрой политологии и права БГПУ. Первостепенное внимание при этом он уделял формированию преподавательского состава, где первостепенное значение имеют поиск новых знаний, ориентация студентов — будущих педагогов — на развитие интеллектуального потенциала, духовности, нравственности. Организуя коллектив единомышленников, профессор Г. В. Корзенко подавал личный пример качественного подхода к совершенствованию подготовки будущих педагогов. Достаточно сказать, что подготовленные с его участием учебно-методические пособия востребованы в вузах Беларуси.

Интеллектуальный продукт, созданный юбиляром, нашёл отражение без малого в 200 публикациях (монографиях, статьях, историографических очерках, биобиблиографических справочниках). Выход каждой работы становился событием. Это — история научного сообщества, формирование системы подготовки научных и научно-педагогических кадров в Беларуси, общие проблемы науки и др. Он является автором галереи портретов белорусских историков, с его именем связано создание обобщающих монографий о развитии и деятельности Института истории НАН Беларуси, большой вклад внесён им в разработку истории Национальной академии наук. Труды Г. В. Корзенко получили международное признание.

Личная жизненная позиция привлекает к профессору студентов, которые видят в нём человека, увлечённого любимым делом — служением истории науки. Георгий Владимирович обладает блестящими ораторскими способностями, умеет не только донести суть политологических проблем до слушателей, но и увлечь их миром политики, целенаправленностью преобразований как в Республике Беларусь, отдельных странах, так и в мировом сообществе. Значимыми человеческими качествами являются умения общаться с людьми, располагать к себе. Импонируют и привлекают в нём внутренняя интеллигентность, культура, порядочность и честность.

Традиции историко-научных исследований, их тематика и проблематика ещё более актуализировались, получили новый мощный импульс в кандидатских и докторской диссертациях, выполненных под руководством профессора. Он ведёт плодотворную работу в Советах по защите докторских и кандидатских диссертаций при Институте истории НАН Беларуси и БГПУ.

С юбилеем Вас, уважаемый Георгий Владимирович!

***М. В. Стрелец**, доктор исторических наук, профессор, профессор Брестского государственного технического университета*